12. *Карпентьер, А.* Об американской чудесной реальности / А. Карпентьер // Мы искали и нашли себя / А. Карпентьер; сост. и автор предисл. В. Б. Земсков. – М.: Прогресс, 1984. – С. 79–92.
13. *Васконселос, Х.* Роль метисации в формировании латиноамериканской цивилизации / Х. Васконселос // Сравнительное изучение цивилизаций: Хрестоматия / сост. Б. С. Ерасов. – М.: Аспект Пресс, 1998. – С. 444–445.
14. Об историко-культурной самобытности Латинской Америки (круглый стол) // Латинская Америка. – 1981. – № 2. – С. 71–119; № 3. – С. 95–130.

**(Дата подачи: 15.01.2018 г.)**

*Т. М. Заблоцкая*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*T. Zablotskaya*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)«16/19»**

# ДА ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ АДУКАЦЫЙНАЙ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КАТАЛІЦКАГА ОРДЭНА ПІЯРАЎ ЛІТОЎСКАЙ ПРАВІНЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНЦЫ XVII – ПАЧАТКУ XX СТ.

# TO THE HISTORY OF STUDYING THE EDUCATIONAL AND CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF THE CATHOLIC ORDER OF THE PIARIST OF THE LITHUANIAN PROVINCE ON BELARUSIAN LANDS IN THE LATE XVII – EARLY XX CENTURY

*У артыкуле аўтар абагуліў дасягненні папярэдняй гістарычнай традыцыі па вывучэнні гісторыі Ордэна Піяраў на беларускіх землях. Існуючая гістарыяграфія тыпалагізуецца паводле моўна-нацыянальнага прынцыпу, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця навуковай думкі адносна рэалізацыі місіі Ордэна Піяраў на беларускіх землях, акрэсліваюцца маладаследаваныя пытанні і перспектыўныя кірункі для даследавання (сетка піярскіх вучэльняў на беларускіх землях, спецыфіка арганізацыі навучальнага працэсу, асабісты склад навучэнцаў і настаўнікаў і г. д).*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; Літоўская правінцыя Ордэна Піяраў; піярскі кляштар; піярскі калегіум.*

*In the article the author summarized the achievements of the previous historical tradition on studying the history of the Order of Piarist in the Belarusian lands. In this work, the existing historiography is typologized according to the linguistic-national principle, the main tendencies in the development of scientific thought regarding the implementation of the mission of the Order of Piarist in the Belarusian lands are determined, the issues and perspective directions for research are outlined (the network of public schools on the Belarusian lands, the specifics of the organization of the educational process, students and teachers, etc.).*

*Key words: historiography; the Lithuanian province of the Order of Piarists; the Piarist of monastery; the Piarist of collegium.*

Гісторыя адукацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці манаскага каталіцкага Ордэна Піяраў з'яўляецца неад'емнай часткай гісторыі адукацыі Беларусі. Гісторыя гэтай супольнасці, і рэалізацыя яе місіі на землях Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на Беларусі, неаднаразова станавіліся прадметам навуковага вывучэння. Аналіз папярэдняй гістарыяграфічнай традыцыі дапаможа выявіць існуючыя лакуны і перспектыўныя накірункі даследавання ў вывучэнні адукацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці Літоўскай правінцыі Ордэна Піяраў ад часоў з'яўлення яго на беларускіх землях да аднаўлення піярскіх навучальных устаноў у ІІ Рэчы Паспалітай.

Вывучэннем гісторыі Ордэна Піяраў на беларускіх землях займаліся ў асноўным даследчыкі двух нацыянальных гістарыяграфічных школ – беларускай (айчыннай) і польскай. Але ўнёсак і маштаб праведзеных даследаванняў прадстаўнікоў гэтых гістарыяграфічных традыцый не аднолькавы з-за спецыфікі іх развіцця. Польская гістарыяграфічная традыцыя сваімі каранямі ўзыходзіць да XVIII стагоддзя, у тым ліку да вядомага прадстаўніка Ордэна Піяраў Мацея Догеля. Таму база прапрацаваных польскімі даследчыкамі крыніц, шырыня метадалагічных падыходаў да рашэння пастаўленых даследчыцкіх задач, як і колькасць падрыхтаваных прац, заслугоўваюць безумоўнай павагі.

Польскіх даследчыкаў у першую чаргу цікавілі праблемы дзейнасці навучальных устаноў Ордэна Піяраў, якія існавалі ў межах Польскай правінцыі. У той жа час у межах польскай гістарыяграфіі практычна адсутнічаюць фундаментальныя даследаванні, якія датычацца тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Інтарэс да беларускай праблематыкі з'явіўся ў польскіх даследчыкаў толькі ў 80–90-я гады XX стагоддзя. Польскія даследчыкі пачынаюць працаваць з архіўнымі матэрыяламі, што дазваляе ім заняцца вывучэннем дзейнасці навучальных устаноў, якія існавалі на беларускіх землях.

Прыгадаем навуковыя сесіі Камітэта гісторыі навукі і тэхнікі Польскай акадэміі навук (Komiteta Historii Nauki i Techniki Polskiej Akademii Nauk). Першы навуковы выезд Камітэта на Лідчыну адбыўся ў чэрвені 1993 г. і быў звязаны з прэзентацыяй кнігі «Уклад піяраў у навуку і культуру Польшчы XVII–XIX стагоддзяў» («Wklad pijarów do nauki i kultury w Polsce XVII–XIX w.») [43], рэдактарам якой была прафесар Ірэна Стасевіч-Ясюкова. Гэта была першая пасля вайны прэзентацыя польскай кнігі на абшарах Беларусі ў Шчучыне.

Другая паездка членаў Камітэта была прысвечана «раслінам, гістарычным садам і паркам у магнацкіх рэзідэнцыях і шляхецкіх дварах на нашай зямлі». На гэты раз галоўнай постаццю стаў слаўны батанік Станіслаў Баніфацый Юндзіл [28].

Польскімі навукоўцамі і даследчыкамі былі вызначаны прыярытэтныя кірункі ў галіне даследавання дзейнасці Піяраў на беларускіх землях. З'явіўся шэраг прац польскіх навукоўцаў.

Артыкул Ярослава Куркоўскага «Выдатныя выкладчыкі і вучні піярскай школы в Шчучыне» [31, с. 83–104], у якім аўтар праводзіць падрабязны аналіз выкладчыцкага складу сярод манахаў выкладчыкаў, адзначае імёны найбольш таленавітых навучэнцаў: Мацей Догіль, Казімір Нарбут, Ігнат Дамейка і інш.

У зборнік «З гісторыі Лідскай зямлі» (Z dziejów Ziemi Lidzkiej) увайшлі публікацыі польскіх гісторыкаў Паўла Камароўскага (Pawła Komorowskiego) [29, с.133–157], Ярослава Куркоўскага (Jarosława Kurkowskiego) [32, с. 55–131], Тадэвуша Новака (Tadeusza Mariana Nowaka) [36, с.11–54].

На сучасным этапе працуюць Марыюш Ауш (Mariusz Ausz) [25, 44], Іанна Бугайска-Вецлавска (Joanna Bugajska-Więcławska) [27, с. 245–269], Ярослаў Куркоўскі [31, 32], Павел Камароўскі [29] і інш.

Уласна беларуская гістарыяграфія звярнулася да праблемы вывучэння гісторыі Ордэна Піяраў адносна нядаўна. Асноўнай асаблівасцю беларускай гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI стагоддзя з'яўляецца тое, што ў большасці выпадкаў вывучэнне дзейнасці Ордэна Піяраў адбываецца на рэгіянальным, краязнаўчым ўзроўні і вядзецца ў кантэксце вывучэння населеных пунктаў, у якіх існавалі піярскія навучальныя ўстановы. Яскравым прыкладам даследаванняў гісторыі піярскіх навучальных устаноў у кантэксце сацыяльна-культурнага развіцця рэгіёна з'яўляюцца выданні з серыі «Памяць»: Шчучынскага, Лідскага, Воранаўскага раёнаў, а таксама па гарадах Полацк і Віцебск [12, с. 66–68, 113; 13, с. 75–77, 109–110, 124–126; 14, с. 59–73]. Трэба адзначыць, што ў айчыннай гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI стагоддзя адукацыйная і асветніцкая дзейнасць каталіцкага Ордэна Піяраў на Беларусі, як і ў польскай гістарычнай навуцы, не з'ўлялася прадметам спецыяльнага даследавання.

У гэтай сувязі мэтазгодным прадстаўляецца правядзенне аналізу існуючай гістарыяграфіі зыходзячы не столькі з нацыянальнага, колькі з праблемнага падыходу.

Першыя працы па гісторыі Ордэна Піяраў у Рэчы Паспалітай з'явіліся яшчэ ў XIX стагоддзі. З тых часоў даследчыкаў найперш цікавіла методыка навучання, якая была прапанавана Станіславам Канарскім (1700–1773). Пад кіраўніцтвам гэтага правінцыяла Польскай правінцыі была праведзена рэформа піярскіх навучальных устаноў. Рэформа прадугледжвала ўвядзенне новых школьных праграм, стварэнне падручнікаў, шырокае выкарыстанне ў практыцы новых метадычных прыёмаў. У курсы піярскіх навучальных устаноў уводзілася «вывучэнне роднай мовы» (на той час у Рэчы Паспалітай яна разумелася як польская), прыродазнаўчых і гуманітарных навук: гісторыі, геаграфіі, замежных моў, а таксама фізічнае выхаванне» [1, с. 195; 2 с. 30–31; 30, 35; 40, с. 47–59].

Існуе значны пласт гістарычных даследаванняў агульных праблем рэлігіі і адукацыі на беларускіх землях, але ў іх прыводзяцца толькі істотныя характарыстыкі гэтай супольнасці. Дадзеная праблематыка за-

краналася даследчыкамі і навукоўцамі ў сувязі з вывучэннем пытанняў гісторыі манаскіх ордэнаў, сацыяльнай гісторыі і гісторыі каталіцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы, а таксама ўзнікненнем і развіццём сістэмы адукацыі на беларускіх землях у другой палове XVIII – пачатку XX стагоддзя.

Так, у энцыклапедычным даведніку «Каталіцкія храмы на Беларусі», падрыхтаваным Анатолем Кулагінам, аналізуецца сярод іншага асноўная архітэктурная спадчына Ордэна Піяраў на беларускіх землях, што дазваляе рэканструяваць і ўдакладніць сетку кляштараў і навучальных устаноў айцоў піяраў [8]. У артыкуле айчыннага даледчыка І. Г. Ганчарук прыводзіцца пералік каталіцкіх манаскіх ордэнаў ў Беларусі ў 1770–1820-х гадах, адзначаецца спецыфіка іх духоўнасці і асаблівасці супольнасцей [3, с. 185–196]. У манаграфіі айчыннага даледчыка А. І. Ганчар раскрываецца дзейнасць рымска-каталіцкай канфесіі па захаванню яе ўплыву ў сферы адукацыі на Беларусі [15].

Асобна неабходна вылучыць рэгіянальны кірунак у даследаванні гісторыі Ордэну Піяраў на беларускіх землях, асабліва ў тым кантэксце, што краязнаўчыя метады даследавання, а таксама «вусная гісторыя» з'яўляюцца актуальнымі метадамі правядзення гістарычных даследаванняў. Так, айчынныя краязнаўцы і рэгіянальныя даследчыкі плённа працуюць над вывучэннем гісторыка-культурнай спадчыны і гісторыі кляштароў, а таксама навучальных устаноў на Шчучыншчыне і Лідчыне. Напрыклад, гарадзенскі гісторык С. У. Данскіх у сваім даследаванні «Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі» падрабязна апісвае абставіны з'яўлення Ордэна Піяраў у Шчучыне, пералічвае імёны фундатараў і фундушы на патрэбы кляштара, адзначае тутэйшыя славутасці – Батанічны сад Юндзіла і аптэку. Праводзіць гістарычны аналіз фактаў наконт знаходжання батанічнага саду на тэрыторыі Шчучына, дзе выказвае ўласныя меркаванні наконт знаходжання апошняга. Дарэчы, знаходжанне батанічнага саду да сёняшняга часу не вызначана, што з'яўляецца надзённай праблемай для ўдакладнення гісторыі Шчучына [4, с. 93–101, 158–162]. Шчучынскія краязнаўцы В. А. Дзежыц і У. М. Мірчук у невялікай брашуры адзначаюць тыпы навучальных устаноў, якія існавалі на Шчучыншчыне, паказваюць дзейнасць айцоў піяраў ў XVII–XVIII стагоддзях і іх ролю ў развіцці адукацыі ў дадзеным рэгіёне [5]. Плённа ў гэтым жа кірунку ў Лідзе працуюць рэгіянальныя гісторыкі Л. Л. Лаўрыш і В. В. Сліўкін [9; 22].

У гэтым жа кантэксце мы можам разглядаць і даследаванні так званай «Гандлёвай школы» ў Лідзе. У 20–30-я гг. XX стагоддзя ў часы II Рэчы Паспалітай адбываецца аднаўленне дзейнасці навучальных устаноў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Навучальная ўстанова адукацыі айцоў піяраў, так званая «Гандлёўка», была вельмі папулярнай сярод навучэнцаў і іх бацькоў. Цікавыя ўспаміны былых вучняў можна прачытаць на старонках мясцовых сродкаў масавай інфармацыі «Лідская газета» [7, с. 11], «Лідскі

Летапісец» [23, с. 22–27], «Ziemia Lidska» [39, с. 52–64]. Карыснымі бываюць успаміны і аповяды жыхароў Ліды, як мясцовых жыхароў [6], так і землякоў, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь [24]. Гэтыя «вусныя крыніцы» актыўна выкарыстоўваюцца сучаснымі даследчыкамі.

Важнай праблемай для даследавання гісторыі Ордэна з'яўляецца арганізацыя навучання і педагагічная дзейнасць айцоў піяраў на землях сучаснай Беларусі. Найбольш уплывовым даследчыкам у гэтай галіне з'яўляецца А. Ф. Самусік. У шэрагу сваіх артыкулаў ён раскрывае прынцыпы арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, вызначае асаблівасці гуманітарнай і прыродазнаўчай падрыхтоўкі ў піярскіх калегіумах, асвятляе праблему патрыятычнага выхавання і нават закранае пытанне забеспячэння навуковай і педагагічнай літаратурай [18, с. 8–11; 19, с. 94–96; 20, с. 3–7; 21, с. 184–189].

Але пры гэтым неабходна адзначыць, што першапачатковыя вытокі даследавання дадзенага кола праблем былі закладзены айчыннымі гісторыкамі яшчэ ў савецкі час [1, с. 124–131; 11].

Пры гэты недастаткова вывучанай застаецца праблема спецыялізацыі розных калегіумаў і іх індывідуальныя асаблівасці. Найбольш раскрыта гісторыя Лідскага [9; 13; 16; 17; 22; 23; 42] і Шчучынскага [4; 5; 14; 31] калегіумаў. У той час як Полацкі, Віцебскі, Лужкоўкі, Дубровенскі ды іншыя калегіумы яшчэ не дачакаліся свайго даследчыка.

Увогуле праблема лакалізацыі, генэзісу і развіцця сеткі піярскіх калегіумаў, як і пытанне пра час іх узнікнення, з'яўляецца па-ранейшаму актуальным даследаваннем. Адной з першых работ у гэтым кірунку з'яўляецца праца віленскага біскупа Яна Курчэўскага, у якой даецца пералік усіх навучальняў піяраў у Віленскім біскупстве [26]. Некаторыя з пералічаных установ да гэтага часу не ўлічваюцца даследчыкамі (напрыклад Ятвеск). У Заходняй Еўропе Ордэн вывучаны падрабязна, асабліва там, дзе існавалі навучальныя ўстановы, а на Усходнюю Еўропу ўвага звернута ў меншай ступені. Але найбольш поўным пералік рэзідэнцый у Літоўскай правінцыі («domus olim exsistentes») і кароткія гістарычныя звесткі пра іх, спіс імёнаў Літоўскіх правінцыялаў з вызначэннем тэрміну знаходжання на пасадзе за перыяд з 1736–1843 гг. дае заходнееўрапейскі манах Піканьёль Леадэгарый [38, с. 270–278].

Праблема колькасці і тэрытарыяльнага размяшчэння Ордэна падымаецца ў працы Станіслава Літака (Stanisław Litak) «Атлас касцёла лацінскага ў Рэчы Паспалітай абодвух народаў у XVIII стагоддзі», у якой даецца пералік асноўных кляштараў і навучальных устаноў Літоўскай правінцыі, якія былі ўтвораны ў першай палове XVIII стагоддзя [34, с. 416–417].

Безумоўна, шмат увагі як айчыннымі, так і замежнымі даследчыкамі надавалася выдатнымі выпуснікам і прафесарам піярскіх калегіумаў. З піярскімі навучальнымі ўстановамі звязаны імёны вядомых навукоўцаў

XVIII–XIX стагоддзяў: гісторыка-археолага Мацея Догеля, філосафа Казіміра Нарбута, біёлага Станіслава Баніфацыя Юндзіла, геолага і мінеролага, даследчыка Чылі Ігната Дамейкі і інш. Іх дасягенні і лёсы цікавілі як польскіх, так і айчынных даследчыкаў. У межах гэтай накуковай праблемы найлепш можна адсачыць метадалагічную розніцу ў падыходах двух нацыянальных гістарычных школ. Напрыклад, асобная праца па Станілаву Юндзілу была падрыхтавана польскай даследчыцай Вандай Грэбэцка (Wandę Grębeska) [28], па Бернарду Сыруцю – Яраславам Куркоўскі [33], па Казіміру Нарбуту – Ірэна Стасевіч-Ясюкова [41]. Гэты пералік можна прадаўжаць, у той час як у айчыннай гістарыяграфіі лёсы гэтых вядомых навукоўцаў і выкладчыкаў разглядаліся толькі ў энцыклапедычных даведніках [10, с. 210–211, 264–265, 408–411, 413–416, 604–606, 633–634].

Вывучэнне місіі Ордэна Піяраў Літоўскай правінцыі ў кантэксце яго заснавання, развіцця і ліквідацыі ў сістэме адукацыі беларускіх зямель з канца XVII да пачатку XX стагоддзя ў гістарычнай рэтраспектыве з’яўляецца маладаследаванай тэмай. Невялікая колькасць прац па гэтай праблеме ў беларускай гістарыяграфіі тлумачыцца недахопам крыніц у айчынных фондасховішчах. У той жа час шматлікія крыніцы адносна дзейнасці Ордэна Піяраў захоўваюцца ў Польшчы і Літве: Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў; Галоўны архіў старажытных актаў; бібліятэка Чартарыйскіх у Кракаве, дзе менавіта знаходзяцца фонды калегіумаў з Полацка і Віцебска. Цікавасць прадстаўляюць таксама «Успаміны апошняга рэктара Лідскай навучальні Юзэфа Вайшвілы» («Wspomnienia Domku Pijarów Lidzkich ks. Józeh Wojszwiłło»), што знаходзяцца ў архіве Піяраў у Кракаве, мікрафільмы якіх захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве; уласныя фонды рукапісаў і старадрукаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве для рэканструкцыі бібліятэчных фондаў піярскіх калегіумаў Літоўскай правінцыі.

Для завяршэння распачатай працы неабходна, каб з’явілася абагульняючая праца, цалкам прысвечаная адукацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці піяраў на беларускіх землях, у якой будуць вызначаны прынцыпы ўнутранай арганізацыі кляштарных, адукацыйных і дабрачынных устаноў ордэна, здзейснены аналіз прасторавага развіцця сеткі навучальных устаноў Ордэна Піяраў Літоўскай правінцыі на аснове дадзеных аб колькасці настаўнікаў-манахаў (колькасны крытэрый), асаблівасцях адукацыйнага працэсу, які ажыццяўляўся ў навучальных установах (якасны крытэрый), вызначаны перыяды інстытуцыянальнай эвалюцыі навучальных устаноў Ордэна Піяраў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / Ткачоў М. А. [і інш]; пад рэд. М. А. Лазарука. – Мінск: Народная асвета, 1985. – 464 с.

2. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус-Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Парашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – 792 с.

3. *Ганчарук, І. Г.* Каталіцкія манаскія ордэны на Беларусі ў 1770–1820-х гг. (спецыфіка духоўнасці і фармацыйныя дамы) / І. Г. Ганчарук // Гістарычны альманах. – Гародня, 2003. – Т. 9. – С. 185–196.

4. *Данскіх, С. У.* Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі / С. У. Данскіх. – Баранавічы: Барановичская укрупнённая типография, 2007. – 251 с.

5. *Дзежыц, В. А.* Адукацыя на Шчучыншчыне у XVIII–XX стст. / В. А. Дзежыц, У. М. Мірчук; Гродзенскае аддзяленне Таварыства Беларускай школы. – Гродна, 2006. – 44 с.

6. *Дзікевіч, М.* Дзітрыкі. Згукі заснуўшай цывілізацыі / М. Дзікевіч. – М.: Выдавецкі дом ТАА «Рытм», 2010. – 200 с.

7. *Дзікевіч, М.* Як навучыўся чытаць і палюбіў беларускую мову: [роздум аўтара аб бел. мове] / М. Дзікевіч // Лідская газета. – 2017. – 4 кастр. – С. 11.

8. *Кулагін, А. М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін; маст. І. І. Бокі. – Мінск: БелЭн, 2000. – 216 с.

9. *Лаўрэш, Л. Л.* Лідскі піярскі калегіум / Л. Л. Лаўрэш // Маладосць. – 2016. – № 11. – С. 120–130.

10. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік / Беларус. энцыкл.; гал. рэд. Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 671 с.

11. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / С. А. Умрэйка [і інш.]; пад рэд. С. А. Умрэйка. – Мінск: Народная асвета, 1968.

12. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Воранаўскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн., 2004. – 592 с.

13. Памяць: Ліда. Лідскі раён: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: В. Г. Баранаў [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2001. – 592 с.

14. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Шчучынскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн., 2001. – 592 с.

15. Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк: монография / А. И. Ганчар. – Гродно: ГГАУ, 2010. – 510 с.

16. *Савук, А.* Паслядоўнік Лінэя (240 год з дня нараджэння С. Б. Юндзіла) Батанік Вялікага княства Літоўскага / А. Савук // Лідскі Летапісец. – 2002. – № 3. – С. 23–28

17. *Самусік, А. Ф.* Лідскі піярскі калегіум / А. Ф. Самусік // Ліда і Лідчына: да 685-годдзя з дня заснавання горада: матэрыялы рэсп. навук.-прак. канф., Ліда, 3 кастр. 2008 г. / рэдкал.: А. П. Худык (гал. рэд.) [і інш.]. – Ліда, 2009. – С. 40–43.

18. *Самусик, А. Ф.* Организация учебно-воспитательного процесса в системе образования Беларуси (последняя треть XVIII – начало XIX в.) / А. Ф. Самусик // Вести Института современных знаний. – 2008. – № 3. – С. 8–11.

19. *Самусік, А. Ф.* Станаўленне гуманітарна-прыродазнаўчай сістэмы адукацыі ў піярскіх калегіумах Беларусі ў першай палове XVIII стагоддзя / А. Ф. Самусік // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя Гуманітарных навук. – 2006. – № 5, ч. 1. – С. 94–96.

20. *Самусік, А. Ф.* Арганізацыя патрыятычнага выхавання ў манаскіх навучальных установах на беларускіх землях у XVI – сярэдзіне XVIII ст. / А. Ф. Самусік // Весці БГПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Культуралогія. – 2015. – № 4. – С. 3–7.

21. *Самусік, А. Ф.* Вучэбна-метадычныя выданні Віленскай піярскай друкарні ў канцы 1750-х – пачатку 1770-х гг./ Матэрыялы міжнароднага кангрэса «500 гадоў беларускага кнігадрукавання» / [склад. А. А. Суша.]. – Мінск: Нац. б-ка Беларусі, 2017. – 360 с.

22. *Сліўкін, В. В.* Гісторыя адукацыі ў Лідзе / В. В. Сліўкін // Лідскі Летапісец. – 2002. – № 3. – С. 23–28.

23. *Сліўкін, В. В.* Гісторыя адукацыі ў Лідзе / В. В. Сліўкін // Лідскі Летапісец. – 2003. – № 1. – С. 22–27.
24. *Ярмонт, Е.* В тени замка Гедымина. Воспоминания детства / Е. В. Ярмонт. – Гродно: КЛР «Сталкер», 1995. – 176 с.
25. *Ausz, M*. Odbudowa Polskiej prowincji Pijarów. Działalność wychowawczo-edukacyjna zakonu w latach 1873–1918. – Lublin: Wydawnictwo uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2013. – 294 s.
26. Buskupstwo Wileńskie. Opracował Ks. Jan Kurczewski, nakładem i drukiem Jozefa Zawadzkiego. – Wilno, 1912. – 614 s.
27. *Bugajska-Więcławska, J.* Program wychowawczy szkoły Handlowej i gimnazjów księży Pijarów w Lidzie / J. Bugajska-Więcławska // Z historii polskich pijarów. – Kraków, 2013. – S. 245–269.
28. *Grębeska, W.* Ogród Botaniczny w Szczuczynie imienia wybitnego ks. Stanisława Bonifacego Jundziłła. – Warzawa – Kraków, 1994. – 18 s.
29. *Komorowski, P.* Prywatne kolegium i szkoła handlowa OO. Pijarów w dwudziestoleciu międzywojennym w Lidzie / P. Komorowski // Z dziejów Ziemi Lidzkiej. – Warszawa,1997. – S. 133–157.
30. *Konopczyński, W*. Stanisław Konarski / W. Konopczyński. – Warszawa,1926.
31. *Kurkowski, J.* Wybitni nauczyciele i uczniowie szkoły pijarskiej w Szczuczynie 1718–1832 / J. Kurkowski // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki. – 1995. – № 1. – S. 83-104.
32. *Kurkowski, J.* Pijarzy w Werenowie i Lidzie (1735–1845) / J. Kurkowski // Z dziejów Ziemi Lidzkiej. – Warszawa,1997. – S. 55–131.
33. *Kurkowski, J*. Bernard Syruć (Siruć) (1731–1784) / J. Kurkowski. – Warszawa – Lublin, 2009. – 64 s.
34. *Litak, S.* Atlas kościoła łacińskiego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVIII wieku. – Lublin, Towarzystwo naukowe katolickiego uniwersytetu Lubelskiego Iana Pawła II, 2006. – 511 s.
35. *Nowak-Dlużewski, J*. Stanisław Konarski / J. Nowak-Dlużewski. – 2 wyd. – Warszawa,1989.
36. *Nowak, T. M.* Obraz Ziemi Lidzkiej na mapach XVI–XVIII wieku / T. M Nowak // Z dziejów Ziemi Lidzkiej. – Warszawa,1997. – S. 11–54.
37. *Nowarski, C.* Prognostyczność myśli ks. Stanisława Konarskiego w zakresie kształcenia i wychowania młodzieży / C. Nowarski // Szkolnictwo pijarskie w czasach minionych. – Kraków – Lublin, 2010. – S. 21–31.
38. *Picanyol, L*. Brevis conspectus historico-statisticus ordinis Shcolarum Piarum (пер. Я. Глінскага) / L . Picanyol. – Romae: Apud curiam generalitiam PP. Scolopi di S. Pantaleo, 1932. – 318 с.
39. Przelotowe miasto z tracycjami (Lida i okolice we wspomnieniach pani Janiny Burakowej) // Ziemia Lidzka. –1994. – № 13. – S. 52–64.
40. *Smykowski, J.* Program edykacyjny Stanisława Konarskiego w świetle współczesnych koncepcji edykacyjnych / J. Smykowski // Szkolnictwo pijarskie w czasach minionych. – Kraków – Lublin, 2010. – S. 47–59.
41. *Stasiewicz-Jasiukowa, I.* Kazimerz Narbutt (1738–1807) / I. Stasiewicz-Jasiukowa. – Warszawa – Lida, 2004. – 79 s.
42. *Szymielewicz, M.* Dzieje pijarów lidzkich / M. Szymielewicz // Ziemia Lidska. – № 9. – 1936. S. 2–4; № 1. – 1937. – S. 2–3; № 3. – 1937. – S. 32–33; № 4 – 1937. – S. 44; № 6–7. – 1937. – S. 62–67.
43. Wkład pijarów do nauki i kultury w Polsce XVII–XIX w. / pod red. I. Stasiewicz-Jasiukowej. – Warszawa – Kraków, 1993. – 652 s.
44. Z historii polskich pijarów / pod red/ dr. M. Ausza. – Kraków, 2013. – 276 s.

**(Дата подачи: 28.02.2018 г.)**